ХРОНІКА БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

1948

* * *

Францыя

Стараньнем Парыскага аддзелу Абьеднаньня беларускіх работнікаў 5 чэрвеня 1948 г. адбылася вечарына ў Салях Сындыкату (26, Rue de Monthokon, Paris 9). Вечарына прайшла ў вельмі прыемным настроі. Было шмат гасьцей з правінцыі.

У сувязі з шостымі ўгодкамі сьмерці Янкі Купалы раніцай 17 чэрвеня была адслужана рэктарам Беларускае рэлігійнае місіі ў Францыі айцом Л. Гарошкам паніхіда ў царкве Св. Супліц.

Па паўдні адбылася ўрачыстая акадэмія ў Салях Хрысьціянскага Сындыкату, наладжаная Абьеднаньнем беларускіх работнікаў. Тры рэфэраты, шэраг вершаў і песьні нашага Прарока склалі праграму. На акадэміі прысутнічала, апрача мясцовых беларусаў, шмат гасьцей з правінцыі.

* * *

Аўстралія

Беларускімі эмігрантамі ў Аўстраліі зложаны мэмарыял аўстралійскаму Міністэрству эміграцыі аб дапушчэньні беларусаў у Аўстралію (ведама, што наш нацыянальны назоў блытае нас з расейцамі ў вачох шматлікіх дзяржаваў). Атрыманы пазытыўны адказ.

1949

* * *

Верхняя Аўстрыя

14.11.1948 г. у Рыдзе (Аўстрыя) адбылася сходка Беларускага Згуртаваньня рыдскага крайсу. На парадку дня стаялі наступныя пытаньні: адчыненьне сходу, выбары прэзы-

дыюму, справаздача аб працы Камітэту Беларускага Згуртаваньня ў Рыдзе, перавыбары Камітэту, бягучыя справы.

* * *

27.11.48 г. у Рыдзе адбылася сходка сяброў Беларускага Згуртаваньня рыдскага крайсу. Сп. А. Я. прачытаў рэфэрат на тэму «28 угодкі Слуцкага паўстаньня», пасьля чаго было прадэклямавана колькі вершаў і прасьпявана некалькі беларускіх песень.

* * *

Ад 1.12.1948 г. у Рыдскім лягеры ДП 701 адчынілася Беларуская школа па ліквідацыі малапісьменнасьці.

* * *

Верхняя Аўстрыя

7.12.1948 г. у Рыдзе адбылася чарговая сходка Беларускага Згуртаваньня рыдскага крайсу. Сп. Я. П. прачытаў рэфэрат на тэму «Падставы вольнасьці асабістай і грамадзкай».

* * *

26.12.1948 г. сп. А. І. прачытаў рэфэрат на тэму: «Бліжэйшыя заданьні Беларускай эміграцыі».

* * *

18.1.1949 г. сп. І. П. прачытаў рэфэрат на тэму «Вартасьць беларуса».

* * *

Францыя

16.1.49 г. адбылася гадавая зборка Парыскага аддзелу Аб'еднаньня беларускіх работнікаў у Францыі, якая прабегла ў цёплай, сямейнай атмасфэры. Пасьля прыняцьця парадку дня, справаздачы рэвізійнай камісіі і падзякі за добрую дзейнасьць старому ўраду, прыступлена да выбару новага — на 1949 год. У склад яго ўвайшлі: старшыня аддзелу — Монід, сакратар — Сьпічонак Віктар, скарбнік — Міцкевіч Валянтын і двох рэфэрэнтаў: культуры — Лысуха Мікалай і спорту — Дыдышка Уладзімер. Наглядная рада створана з наступных сяброў: Бут-Гусаім Васіль, Наўмовіч

Міхась, Чыгір Янка, Казак Язэп і Высоцкі Язэп. Сяброўскі суд выбраны пад кіраўніцтвам айца Льва Гарошкі.

Новы ўрад зь месца прыступіў да працы, ад сяньня арганізуе супольную ўкраінска-беларускую культурную забаву (з мастацкімі выступамі), якая адбудзецца 19.2.1949 г. Просіцца сяброў з правінцыі прыняць гэта да ведама і па меры магчымасьці прыбыць на яе.

Новай управе Парыжскага Аддзелу «A.B.R.F.» жадаем спорнае працы.

* * *

23.1.49 г. нашыя сябры ў Парыжы мелі гонар прыняць у Хрысьціянскім Сындыкаце высока паважаных гасьцей зь Нямеччыны — сп. др. Грабінскага і сп. др. Тумаша, ад якіх пачулі аб жыцьці і дзейнасьці нашых суродзічаў у Брытанскай Зоне Нямеччыны.

* * *

Стараньнем беларускага Выдавецкага Фонду ў Францыі выйшаў з друку, на жаль, з апазненьнем, скромны Беларускі каляндар у апрацоўцы сябра Наўмовіча Міхася — студэнта-скульптара Парыскай Акадэміі мастацтва. У календары маецца шэсьць адрыўных лісткоў (па два месяцы на кожны) з усімі сьвятамі новага і старога стылю. Пажаданым было б, каб кожны беларус, меў у сябе беларускі каляндар. Замаўленьні кіраваць на адрас: «A.B.R.F.», 26, rue de Montholon, Paris 9, або на адрас «Моладзі», 2, rue du Parc Cheviron, Sevreset (S. O.).

Цана з перасылкай — 100 фр.

* * *

Прыпамінаем, што стараньнем гэтага Фонду маецца брашура ў французкай мове Рыдлеўскага «Bielorussie», якую можна замаўляць пад вышэй паданымі адрасамі. Цана з перасылкай — 120 франкаў.

* * *

19.2.49 г. у залях «Cociete des Savantes» у Парыжы адбыўся супольны Украінска-Беларускі вечар прыязьні, на які, акрамя ўкраінцаў і беларусаў з Парыжа і правінцыі, прыбыла вялікая колькасьць гасьцей іншых нацыянальнасьцяў. У праграму вечара ўвайшоў канцэрт, ладжаны ўкраінцамі і беларусамі, а пасьля — агульная забава. Украінскія песьні і

танцы, беларуская «Лявоніха», песьні «Калініца», «Лявон» і іншыя, выкананыя нашымі сяброўкамі і сябрамі, выклікалі вялікае ўражаньне і пашану сярод публікі.

Адзін швайцарскі журналісты, які быў на забаве, сказаў: «Я шчасьлівы, што меў нагоду прысутнічаць на гэтым вечары, на якім мог пазнаёміцца з вамі (беларусамі і ўкраінцамі) ды пабачыць вашае прыгожае народнае мастацтва. Застанецца аб ім у мяне вельмі мілае ўражаньне». Забава прабегла ў прыемнай сяброўскай атмасфэры. Жадаем нашай ініцыятыўнай групе і Парыскаму аддзелу АБРФ найлепшых посьпехаў у далейшай працы пры арганізаваньні падобных імпрэзаў.

ПЕРШЫ ЗЬЕЗД БЕЛАРУСКАЕ МОЛАДЗІ Ў ФРАНЦЫІ

26 сакавіка 1949 году ў Парыжы, у залі Сындыкату СФТС, сьвяточна ўдэкараванай бел-чырвона-белым сьцягам, пад агульны сьпеў нашай ваяцкай песьні-малітвы «Беларусь, наша Маці-Краіна», урачыста распачаў сваю працу Першы Зьезд беларускае моладзі ў Францыі, асноўным заданьнем якога было залажэньне адзінай, самастойнай Арганізацыі беларускае моладзі на тэрыторыі Францыі. Зьезд ушанавалі сваёю прысутнасьцю гэткія высокапаважаныя госьці, як сп. Прэзыдэнт БНР М. Абрамчык, Старшыня Рады Сусьветнага Аб'еднаньня беларускае эміграцыі (САБЭ) сп. інж. Л. Рыдлеўскі, ягоны заступнік на Францыю сп. інж. У. Шыманец і рэктар Беларускае рэлігійнае місіі ў Францыі айцец Леў Гарошка. На Зьезьдзе прысутнічалі гэтаксама госьці ад братняе ўкраінскае моладзі.

Прывітальныя словы высокапаважаных гасьцей, якімі распачаўся Зьезд, а перадусім — словы сп. Прэзыдэнта БНР, спатканыя гарачымі воплескамі прысутных, далі ясны ідэалягічны напрамак працы ўсяе беларускае моладзі на грамадзка-нацыянальнай ніве ў сяньняшніх умовах эміграцыйнага жыцьця. Кожны дэлегат вычуваў у гэтых цёплых словах ня толькі заклік да самаахвярнае працы на карысьць нашага шматпакутнага, паняволенага народу, але й шчыры бацькаўскі клопат старэйшых людзей, дасьведчаных у шматгадовым змаганьні за Незалежнасьць сваёй Бацькаўшчыны, за духовы стан і грамадзкае выхаваньне кожнага маладога беларуса. Гэтыя словы шмат прычыніліся да ўсяго пасьпяховага прабегу працы, у якім адбыўся Першы Зьезд беларускае моладзі ў Францыі. Бальшыня дэлегатаў Зьезду была пераважна з Парыжу ды ягоных бліжэйшых ваколіцаў, а іншыя дэлегаты, ня маючы магчымасьцяў асабіста прысутнічаць на Зьезьдзе, даслалі свае мандаты, прывітальныя лісты й пажаданьні памыснае працы. Нягледзячы на параўнальна невялікую колькасьць дэлегатаў (15 асобаў), Зьезд прайшоў надзвычай пасьпяхова, у паважных дыскусіях ды цёплай сяброўскай атмасфэры пры вялікай зацікаўленасьці дэлегатаў тым адказным заданьнем, якое ўсклала на гэты Зьезд уся беларуская моладзь у Францыі. Кожнае пытаньне й прапанова абгаворваліся дэлегатамі ўсебакова, з гледзішча на іхнае практычнае правядзеньне ў Арганізацыі беларускай моладзі ды іхнае карысьці ў агульным пляне нацыянальна-грамадзкага руху беларусаў на эміграцыі. Асабліва вялікая ўвага дэлегатаў была зьверненая на праграму працы і праект Статуту Арганізацыі, запрапанаваны Зьезду ініцыятыўнай групай моладзі. Было пададзена шмат каштоўных заўвагаў ды прапановаў што да тэксту Статуту ды пляну працы Цэнтральнае ўправы БНАМ, абранай Зьездам бальшынёю галасоў. Гэтаксама былі прынятыя Зьездам важныя пастановы ды рэзалюцыі, у якіх адлюстроўвалася гарачае імкненьне нашай моладзі да самаахвярнае працы й змаганьня за сьветлы ідэал 25 Сакавіка. Дэлегаты Зьезду ў сваім адчыненым лісьце да сп. Прэзыдэнта БНР аднадушна прысягнулі, што будуць непахісна стаяць пад бел-чырвона-белым сьцягам Беларускае Народнае Рэспублікі ды прыкладуць усе свае маладыя сілы на зьдзяйсьненьне ейных ідэалаў. Гэтым дэлегаты Зьезду выказалі думку і жаданьні беларускае моладзі, запэўніўшы Урад БНР, а разам зь ім і ўвесь беларускі народ, што ягоная моладзь будзе заўсёды знаходзіцца ў першых шэрагах змагароў за Незалежнасьць Беларусі.

Першы Зьезд беларускае моладзі ў Францыі, заклаўшы Беларускую Незалежніцкую Арганізацыю Моладзі (БНАМ), выканаў гэтым вялікую місію ўсяе беларускае моладзі ў Францыі, якая ў грамадзкім жыцьці сталася дасьпелаю да таго, каб мець сваю дзейную й самастойную Арганізацыю.

Праграма дзейнасьці БНАМ, прадыктаваная Першым Зьездам беларускае моладзі ў Францыі, цалкам адпавядае

духовым імкненьням кожнага маладога беларуса, якому дорага імя й Незалежнасьць свае Бацькаўшчыны, а ў гэтым ёсьць вялікая зарука таго, што Арганізацыя моладзі ў Францыі станецца адною з найбольш дзейных, актыўных беларускіх арганізацыяў на тэрэне Францыі.

ПРАТАКОЛ ПЕРШАГА ЗЬЕЗДУ БЕЛАРУСКАЕ МОЛАДЗІ Ў ФРАНЦЫІ, ЯКІ АДБЫЎСЯ 26 САКАВІКА 1949 ГОДУ Ў ПАРЫЖЫ

На Зьезьдзе прысутнічала 15 дэлегатаў і 6 гасьцей.

Парадак дня:

1. Адкрыцьцё Зьезду. (Адсьпяваньне ваяцкае малітвы.)
2. Выбары прэзыдыюму Зьезду.
3. Прывітаньні.
4. Рэфэрат Я. Філістовіча пра ідэалягічнаю аснову й грамадзкія заданьні Арганізацыі моладзі.
5. Дыскусія пасьля рэфэрату.
6. Праект Статуту Арганізацыі.
7. Выбары кіруючых органаў Арганізацыі.
8. Плян працы Цэнтральнае ўправы Арганізацыі.
9. Пастановы й рэзалюцыі Зьезду.
10. Вольныя прапановы.
11. Закрыцьцё Зьезду.

1.

Ад імя Ініцыятыўнай групы беларускае моладзі ў Францыі адчыніў Зьезд сябра Я. Філістовіч, вітаючы гасьцей і дэлегатаў ды жадаючы памыснае працы ў правядзеньні Зьезду. Па гэтым прысутныя адсьпявалі «Беларусь, наша Маці-Краіна».

2.

Адчыненым галасаваньнем бальшынёю галасоў прысутныя абралі:

а) на старшыню Зьезду — сябра Я. Філістовіча, б) на сакратара — сябра А. Кавалеўскага, в) у прэзыдыюм — сяброў Ільяшэвіча і Дубоўскага.

3.

а) Старшыня Зьезду зачытаў прывітальныя лісты, адрасаваныя Першаму Зьезду моладзі ў Францыі. Лісты былі ад сп. палкоўніка Кушэля, сяброў: Я. Сурвілы, Б. Нагорнага (ад групы з 8-мі чалавек), Грыгаровіча В., Кімстач В., Касьцюка Гені і іншых, якія з розных прычынаў не маглі прыехаць у Парыж.

б) Пасьля адчытаньня лістоў першым з высокапаважаных гасьцёў слова ўзяў сп. Прэзыдэнт БНР М. Абрамчык, які прывітаў Зьезд цёплымі словамі, адзначаючы, што маладое пакаленьне дапаўняе барацьбу з д'ябальскімі сіламі сусьвету й прыносіць у жыцьцё сьвятло ды творчую энэргію. Дадаючы да гэтага, што ворагі нашае Бацькаўшчыны на працягу стагодзьдзяў сьведама адрывалі беларускую моладзь ад змаганьня за сьветлыя нацыянальныя ідэалы беларусаў, сп. Прэзыдэнт горача заклікаў дэлегатаў Зьезду, а разам з гэтым і ўсю беларускую моладзь, да цеснага супрацоўніцтва са старэйшым беларускім грамадзянствам, да поўнага згарманізаваньня свае працы са слаўнымі здабыткамі старэйшых беларусаў, аддаўшых свае сілы на змаганьне за Вольную й Незалежную Беларусь. «Маладое беларускае пакаленьне, — сказаў сп. Прэзыдэнт, — мусіць заняць у адпаведны час месца старэйшых змагароў за Незалежную Беларусь». Сп. Прэзыдэнт на яскравых прыкладах нашае гісторыі паказаў, як у свой час маладое пакаленьне дало грамадзтву гэткія слаўныя імёны, як вялікі князь Сапега, асілак-змагар за незалежнасьць беларускага народу, нацыянальны герой Кастусь Каліноўскі, міністар незалежнае беларускае дзяржавы — Грыб і шэраг іншых, па прыкладу якіх павінна і сяньня ісьці нашая моладзь. На заканчэньне свае прывітальнае прамовы сп. Прэзыдэнт пажадаў памыснае працы новай Арганізацыі моладзі і заклікаў да навязаньня лучнасьці з усёю моладзьдзю ў Францыі ды ў іншых краінах.

в) Айцец рэктар Леў Гарошка ў сваёй прывітальнай прамове да Зьезду адзначыў вялікую й паважную ролю моладзі ў грамадзкім жыцьці. Падаючы, як прыклад, што маладая пчала (з назіраньняў) выконвае сваю працу хутчэй і лепш ад старэйшае, ён сказаў, што на гэтым палягае Боская ўказка, якая не мінае й нашую моладзь. «Маладыя беларусы ў грамадзкім жыцьці павінны выконваць свае заданьні гэтак жа старанна, як і маладая пчала, бо моладзі нездарма да-

дзеная Ўсемагутным энэргія і вялікая сіла да творчага дзеяньня, — сказаў айцец Леў Гарошка. — Бог даў вам, моладзі, гэтую сілу, й вы павінны яе выкарыстаць на славу й радасьць усяго нашага беларускага грамадзянства».

г) Ад імя Аб'еднаньня беларускіх работнікаў у Францыі з прывітальным словам выступіў сп. інж. Л. Рыдлеўскі. Вітаючы Зьезд, сп. інж. Л. Рыдлеўскі адзначыў, што нашая моладзь, апынуўшыся на эміграцыі, знаходзіцца пад небясьпечнымі ўплывамі вонкавага эўрапейскага жыцьця, якое можа часам адарваць беларускую моладзь ад змаганьняў старэйшага грамадзтва за адвечны ідэал беларусаў, і таму заклікаў да як найцясьнейшага супрацоўніцтва Арганізацыі моладзі зь дзеячамі ды арганізацыямі, якія непахісна стаяць на грунце 25 Сакавіка і БНР. «Мы ведаем, — сказаў сп. інж. Л. Рыдлеўскі, — што духова беларускі народ ня зьнішчаны, а гэтаму яшчэ адзін доказ — Зьезд беларускае моладзі ў Францыі».

д) Ад імя Сусьветнага Аб'еднаньня беларускае эміграцыі склаў прывітаньне заступнік Старшыні і фінансавы рэфэрэнт Аб'еднаньня сп. інж. У. Шыманец. У кароткіх словах ён паклаў надзеі на тое, што Бог дасьць сілаў нашай моладзі, каб дамагчыся паважных вынікаў у нацыянальна-грамадзкай працы Арганізацыі моладзі на шляху да зьдзяйсьненьня вялікага ідэалу 25 Сакавіка — поўнае незалежнасьці нашае Бацькаўшчыны.

з) Ад імя Саюзу ўкраінскіх пластуноў зь цёплым прывітальным словам выступіў сп. Вішнеўскі. «Нашыя народы, — сказаў ён, — можна назваць братнімі народамі. Мы мелі шмат супольнага ў гісторыі разьвіцьця нашых дзяржаваў, і сяньня лёсы нашых паняволеных краёў аднолькавыя. Спадзяюся, што й на будучыню нашыя народы будуць жыць па-братэрску, у цесным сяброўстве, а перадусім веру ў моцнае сяброўства беларускае моладзі з украінскаю».

4.

Ад імя Ініцыятыўнае групы моладзі ў Францыі адчытаў рэфэрат сябра Я. Філістовіч. Коратка зацеміўшы аб вялікай ролі беларускае моладзі ў слаўнай мінуўшчыне нашае Бацькаўшчыны, аб ейным адвечным змаганьні з рознымі акупантамі нашае зямлі, ён сказаў, што і ў сяньняшніх абставінах эміграцыйнага жыцьця беларуская моладзь ня ёсьць пасыўнаю ў агульна-нацыянальнай і грамадзкай працы, а надалей, калі гэтага будзе вымагаць час, — самаахвярна пойдзе на змаганьне з ворагамі нашае Бацькаўшчыны за ейную поўную незалежнасьць, занатаваную вялікім Актам 25 Сакавіка 1918 году. Асноўным грамадзкім заданьнем кожнага маладога беларуса Я. Філістовіч назваў самаахвярную працу беларускае моладзі ў кожнай галіне, а перадусім, у Арганізацыі моладзі, якая мае цалкам адпавядаць духовым і нацыянальным імкненьням нашае моладзі.

5.

У дыскусіях пасьля рэфэрату сябра А. Кавалеўскі сказаў аб тых канкрэтных заданьнях, якія на думку Ініцыятыўнай групы моладзі ў Францыі, паклікаўшай Зьезд, стаяць на сяньня перад Арганізацыяю моладзі. Гэтыя заданьні наступныя:

1) рэпрэзантацыя навонкі;

2) выхаваньне моладзі ў беларускім нацыянальным духу;

3) супрацоўніцтва з усімі арганізацыямі, якія ўваходзяць у склад САБЭ, і навязаньне сяброўскае лучнасьці з арганізацыямі моладзі іншых нацыянальнасьцяў;

4) арганізаваньне беларусаў, якія яшчэ і па сяньня знаходзяцца ў чужацкіх асяродках, і канцэнтраваньне беларускае моладзі ля цэнтру Францыі.

Па пункце 1-м сябра А. Кавалеўскі адзначыў, што нашая моладзь, а перадусім ейная Арганізацыя, павінна паставіць сабе за мэту пашырэньне спаміж чужынцаў назову, культуры, нацыянальных ідэяў і здабыткаў беларускага народу, выконваючы гэтым сяньня свой першачарговы нацыянальны абавязак. Кажучы аб практычным правядзеньні ў жыцьцё гэтае мэты, ён назваў 4 асноўныя задачы:

а) арганізаваньне тэатральнае адзінкі — сталага гуртку мастацкае самадзейнасьці, а надалей — Тэатру беларускае моладзі;

б) арганізаваньне спартовых адзінкаў і сяброўскіх сустрэчаў са спартовымі арганізацыямі іншых нацыянальнасьцяў;

в) залажэньне сталае рэдкалегіі часапісу «Моладзь», якая узяла б на сябе адказнасьць за тое, каб гэты часапіс мог годна рэпрэзэнтавацца ня толькі спаміж беларускае моладзі, але й чужынцаў;

г) арганізаваньне мастацкіх выставаў, літаратурных і сяброўскіх вечароў, якія маглі б прыцягнуць да сябе ўвагу людзей іншых нацыянальнасьцяў.

Па пункце 2-м сябра А. Кавалеўскі, апіраючыся на словы Старшыні САБР сп. інж. Л. Рыдлеўскага, сказаў, што вельмі важным заданьнем, якое на сяньня ляжыць перад БНАМ, павінна быць выхаваньне моладзі ў нацыянальным беларускім духу, гэтаксама, як і павышаньне агульнае культуры й ведаў кожнага маладога беларуса із тым, каб ён, вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, мог стацца павучальным прыкладам братом у нацыянальным і агульна-культурным сэнсе. Гэтую задачу сябра А. Кавалеўскі паклаў пераважна на рэдкалегію часапісу «Моладзь» і на тыя культурна-выхаваўчыя пададдзелы Арганізацыі, аб зарганізаваньні якіх гаварылася ў пункце першым.

Па пункце 3-м сябра А. Кавалеўскі адзначыў неабходнасьць найцясьнейшага супрацоўніцтва Арганізацыі моладзі з усімі арганізацыямі, уваходзячымі ў склад САБЭ, і навязаньне сяброўскае лучнасьці з арганізацыямі моладзі іншых нацыянальнасьцяў, што прычыніцца да павышэньня грамадзкае сьведамасьці нашае моладзі й агульнага росту ейнае культуры.

Па пункце 4-м сябра А. Кавалеўскі, адзначаючы высілкі старэйшага грамадзянства ў арганізаваньні беларусаў-адзінкаў, расьцярушаных па чужацкіх асяродках Францыі, у нацыянальна-грамадзкія арганізацыі, сказаў, што нашая моладзь ні ў якім разе ня можа быць у баку ад гэтае важнае агульна-нацыянальнае справы, і будучая Арганізацыя моладзі павінна мець за заданьне дапамагчы старэйшаму грамадзтву у гэтым напрамку ўсімі магчымымі сродкамі. Дзеля практычнага правядзеньня ў жыцьцё ўсяго вышэйсказанага ён запрапанаваў будучай арганізацыі, а перадусім — ейнай Цэнтральнай управе — у меру магчымасьцяў сьцягваць з правінцыяў паадзіночна найбольш актыўную моладзь да Парыжу, займаючыся дзеля гэтага падшуканьнем працаў, памяшканьняў і адпаведных дазволаў уладаў на пражыцьцё.

6.

Старшыня Зьезду адчытаў праект Статуту БНАМ, запрапанаваны Зьезду Ініцыятыўнай групай моладзі ў Францыі. Праект Статуту Арганізацыі Моладзі выклікаў спаміж дэлегатаў шмат спрэчных пытаньняў, таму бальшынёю галасоў было пастаноўлена галасаваць за прыняцьцё кожнага паасобнага параграфу гэтага праекту. Пасьля падрабязнага абгаварэньня паасобных параграфаў і пунктаў праекту Статуту Арганізацыі Зьезд аднагалосна зацьвердзіў канчатковы зьмест Статуту БНАМ, тэкст якога мае быць выданы ў асобнай брашуры.

7.

Выбары кіруючых органаў БНАМ, згодна агульнае пастановы Зьезду, былі зачыненымі, тайнымі, прычым галасы падаваліся за кожную кандыдатуру паасобку.

Бальшынёю галасоў Зьезд абраў Цэнтральную ўправу БНАМ у складзе сяброў:

1) Я. Філістовіч — Старшыня Цэнтральнае ўправы БНАМ;
2) А. Кавалеўскі — Сакратар Цэнтральнае ўправы БНАМ;
3) М. Наўмовіч — Скарбнік Цэнтральнае ўправы БНАМ.

Рэвізійную камісію БНАМ, прычым, кожны дэлегат меў два галасы, па колькасьці сяброў камісіі, Зьезд абраў у складзе наступных сяброў:

1) А. Монід — Старшыня Рэвізыйнае камісіі БНАМ;
2) Я. Сурвіла — сябра Рэвізыйнае камісіі БНАМ;
3) М. Хоміч — сябра Рэвізыйнае камісіі БНАМ.

Гэтакім жа парадкам адбыліся выбары Сяброўскага Суду БНАМ, у склад якога ўвайшлі:

1) Н. Ляўковіч — Старшыня Сяброўскага Суду БНАМ;
2) М. Лысуха — сябра Сяброўскага Суду БНАМ;
3) М. Абрамчык — сябра Сяброўскага Суду БНАМ.

8.

На Зьезьдзе быў прыняты адпаведны плян працы Цэнтральнае ўправы Арганізацыі моладзі да часу наступнага агульнага Зьезду (ягоны тэкст дакладна абгавораны сябрам А. Кавалеўскім):

1) арганізаваць Аддзелы БНАМ;
2) закладаць аддзелы культуры;
3) выявіць сяброў на усёй тэрыторыі Францыі;
4) старацца сьцягнуць як найбольш моладзі да Парыжу;
5) паставіць часапіс «Моладзь» на адпаведную вышыню і зрабіць яго часовым органам БНАМ;
6) навязаць лучнасьць і супрацоўнічаць з усімі арг. моладзі;
7) навязаць цесную лучнасьць зь беларускай моладзьдзю ў Нямеччыне, Англіі, Бэльгіі і другіх краінах;

8) залегалізаваць БНАМ перад францускімі ўладамі.

Як выснаў з працы Першага Зьезду беларускае моладзі ў Францыі, былі прынятыя рэзалюцыі й лісты:

1) спадару Прэзыдэнту БНР М. Абрамчыку;

2) сусьветнаму Аб'еднаньню беларускае Эміграцыі (САБЭ);

3) спадару палкоўніку Ф. Кушэлю;

4) спадару В. Пануцэвічу;

5) айцу Чэрняўскаму Франуку.

Старшыня, зачыняючы Першы Зьезд беларускае моладзі ў Францыі, склаў падзяку прысутным гасьцём і дэлегатам за пасьпяхова праведзеную Зьездам працу й выказаў надзею на тое, што новая Арганізацыя моладзі — БНАМ — будзе карыстацца падтрымкаю ня толькі беларускай моладзі, але і ўсяго актыўнага старэйшага грамадзтва.

Старшыня I Зьезду БНАМ (Янка Філістовіч)

Сакратар I Зьезду БНАМ (Аўген Кавалеўскі)

РЭЗАЛЮЦЫЯ I-ГА ЗЬЕЗДУ БЕЛАРУСКАЕ МОЛАДЗІ Ў ФРАНЦЫІ

1) Першы Зьезд беларускае моладзі ў Францыі, запачаткаваўшы Беларускую Незалежніцкую Арганізацыю моладзі (БНАМ) у Францыі, запэўнівае Раду і Урад БНР на чале зь ейным сп. Прэзыдэнтам, што прыложыць усе маладыя сілы дзеля зьдзяйсьненьня вялікіх ідэалаў 25 Сакавіка й БНР.

2) Першы Зьезд беларускае моладзі ў Францыі просіць усе беларускія арганізацыі на чале з Цэнтраляю Сусьветнага Аб'еднаньня беларускае эміграцыі аб навязаньні лучнасьці, цесным супрацоўніцтве й дапамозе Беларускай Незалежніцкай Арганізацыі моладзі (БНАМ) у Францыі;

3) Першы Зьезд беларускае моладзі ў Францыі зьвяртаецца з заклікам да ўсяе беларускае моладзі, якая знаходзіцца на тэрэне французкае дзяржавы, уступіць у актыўныя сябры гэтае Арганізацыі. Арганізацыя беларускае незалежніцкае моладзі, базуючыся на сьветлых ідэалах 25 Сакавіка й БНР, цалкам адпавядае духовым і нацыянальным імкненьням кожнага маладога беларуса, для якога дарагая нашая Бацькаўшчына й ейная поўная Незалежнасьць.

Няхай жыве БНАМ!

Няхай жыве братэрскае адзінства беларускае моладзі ва ўсім сьвеце!

Няхай жыве вялікі Ідэал 25 Сакавіка!

Жыве Беларусь!

Парыж, 26.3.1949 г.

Старшыня БНАМ (Янка Філістовіч)

Сакратар БНАМ (Аўген Кавалеўскі)

ПЕРШЫ СУСЬВЕТНЫ ЗЬЕЗД БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ

Ад 28 лістапада да 2 сьнежня г. г. трываў у Парыжы першы ў гісторыі беларускага народу Сусьветны зьезд беларускай эміграцыі. На Зьезьдзе былі прадстаўлены дэлегаты 25 беларускіх эміграцыйных арганізацыяў з наступных краінаў: Англіі, Аргентыны, Аўстраліі, Бэльгіі, Даніі, Італіі, Канады, Нямеччыны, Францыі і Швэцыі. Асабіста прысутнічалі дэлегаты з Францыі, Англіі, Бэльгіі і Нямеччыны. З другіх краінаў мясцовыя арганізацыі ці выбраныя дэлегаты, з узгляду на немагчымасьць прыезду, прысылалі свае мандаты на мясцовых беларусаў.

Зьезд распачаўся ў нядзелю а гадзіне 9.30. Пасьля выбару прэзыдыі і мандатнае камісіі выступіў з прывітальным словам сп. Прэзыдэнт БНР — інж. Абрамчык. А гадзіне 11 дэлегаты і госьці выслухалі Службу Божую ў беларускай царкве. У канцы імшы айцец рэктар Леў Гарошка меў казаньне, закончанае супольнаю малітваю аб багаславенстве Зьезду.

Пасьля абеднага перарыву распачаліся даклады дэлегатаў паасобных краінаў, якія закончыліся наступнага дня. Як выснавак з гэтых дакладаў, была прынята адпаведная рэзалюцыя. На трэці дзень быў прыняты статут САБЭ (Сусьветнага Аб'еднаньня Беларускай Эміграцыі), гэтак гучыць назоў новай арганізацыі, і выбрана галоўная ўправа САБЭ. На старшыню новай арганізацыі выбраны сп. інж. Лявон Рыдлеўскі, заступнікі старшыні: інж. Шыманец Уладзімір, інж. Тамашчык Уладзімір, праф. Жук-Грышкевіч Вінцук. Сакратар — сп. Сурвіла Янка. Фінансавы рэфэрат

даручаны 1-му старшыні, прэса і інфармацыя — сп. Манькоўскаму Пётру. Архіў і дакумэнтацыя — праф. Нікану. Культурны рэфэрат — праф. Грышкевічу. Рэфэрат духовай апекі даручаны ўладыцы Сяргею, апекуну Беларускай Аўтакефальнай царквы ў дачыненьні да праваслаўных беларусаў і айцу Чарняўскаму Франуку — у дачыненьні да каталікоў. Рэфэрат сацыяльнай апекі — айцу Льву Гарошку, яму ж даручаны і рэфэрат перасяленчы. У наглядную раду выбраныя: сп. Каханоўскі Аўгень — старшыня, Рагуля Барыс — заступнік, Лашук Алаксандар — сакратар, Кукель Часлаў і Мурашка Юстын — кандыдаты. У грамадзкі суд выбраныя: праўнік Галяк Лявон — старшыня, Кушаль Францішак — заступнік, Сташкевіч — сакратар, Міцкевіч Міхась і Рагажэцкі — кандыдаты.

Была прынята пастанова ў справе шкодніцкай акцыі сярод беларускай эміграцыі, а таксама зварот да беларусаў з заклікам гуртавацца вакол беларускага нацыянальна-вызвольнага руху. У канцы было прынята некалькі важных пастановаў адносна каардынацыі працы, прэсы і т. д. 2 сьнежня позна вечарам Зьезд закончыў сваю працу.

Без сумліву, гэты першы ў жыцьці беларускай эміграцыі Зьезд мае аграмаднае значэньне для агульнае беларускае справы, ён пацьвярджае дасьпеласьць беларускага грамадзянства праводзіць сваё жыцьцё.

* * *

Аўстрыя

Стараньнем мясцовага Аб'еднаньня беларусаў быў наладжаны ў лягеры ДП у Рыдзе абход нацыянальнага Сьвята 25 Сакавіка. На ўрачыстасьці былі таксама беларусы з ваколіцы, між якімі былі блізкі сваяк Якуба Коласа М. Міцкевіч і былы малады беларускі партызан А. Пячэрскі.

Урачыстасьць распачалася богаслужэньнем, якое адправіў у лягернай капліцы ведамы беларускі сьвятар Ян Пятроўскі. У сваім казаньні, апіраючыся на тэкст Божых Словаў, узятых зь Дзеяньня Сьв. Апосталаў, пастар Я. Пятроўскі зьвярнуў увагу прысутных на тое, што права на ўладаньне нашай зямлёю мы атрымалі ад Бога, і што ніякая сіла пад сонцам ня можа нас пазбавіць гэтага права да нашае зямлі, да волі, да жыцьця. Акт 25 Сакавіка зьяўляецца дакумэнтам, які сьведчыць аб тым, што народ беларускі

ўсьведаміў дадзеныя Богам правы, і што ў гэтай сьведамасьці ёсьць зарука шчасьлівае будучыні беларускага народу.

А 14-ай гадзіне, адбылася ўрачыстая сходка, падчас якое кіраўнік тамтэйшага аб'еднаньня сп. А. Яцэвіч прачытаў рэфэрат на тэму «25 Сакавік», у якім нарысаваў прысутным вобраз ахвярнага змаганьня беларускага народу ў мінуўшчыне і поўную спадзею гэтага змаганьня на будучыню, якая цесна вяжацца зь Ідэалам Акту 25 Сакавіка.

А 17-й гадзіне жанчыны запрасілі прысутных на «гарбатку», дзе ў прыгожа ўбранай зеленьню, гэрбам і сьцягамі салі ў прыемнай сямейнай атмасфэры сабраліся ўдзельнікі сьвяткаваньня. Сьвятар Ян Пятроўскі падкрэсьліў значэньне Акту 25 Сакавіка для захаваньня пачуцьця і гарантыі беларускаму народу свабоднага жыцьця і разьвіцьця ягоных духовых, нацыянальных і культурных сілаў. Навязваючы да сказанага, сп. М. Міцкевіч падкрэсьліў значэньне волі для беларускага народу і заклікаў прысутных да ахвярнае працы і выканьньня сваіх абавязкаў дзеля рэалізацыі зьместу 25 Сакавіка. Малады прадстаўнік беларускіх партызанаў А. Пячэрскі даў кароткі нарыс змаганьня лепшых сыноў беларускага народу за волю, за лепшую будучыню беларускага народу, за шчасьце, падкрэсьліваючы тыя ахвяры, якія панесьлі нашыя змагары за сьвятую справу.

Пасьля гэтых слоў прысутныя ўсталі са сваіх месцаў дзеля адданьня пашаны памяці тых, якія аддалі сваё жыцьцё за Бацькаўшчыну-Беларусь.

Удалае выкананьне беларускае песьні прыгожа дапоўніла вечар.

У канцы былі сабраныя добраахвотныя ахвяры ў грашох на беларускі друк у Аўстрыі.

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СЬВЯТА Ў КРЭЎСОТ

27.3.49 г. у Ле Крэўсот стараньнем філіі Аб'еднаньня беларускіх работнікаў у Францыі адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне беларускага нацыянальнага сьвята 25 Сакавіка. На праграму дня склаліся: Служба Божая, адпраўленая айцом Ф. Чарняўскім, які сказаў вельмі ўзнёслае і кранаючае казаньне, сьвяточная Акадэмія, што адбылася ў салі

сындыкату а гадзіне 15.30, у якую ўвайшоў абшырны рэфэрат на тэму 25 Сакавіка, нацыянальныя песьні і вершы з патрыятычнай творчасьці. Прыгожыя словы прыхільнасьці да беларусаў выразіў на Акадэміі прадстаўнік французкага Сындыкату СФТС сп. Дэкрэо. Лічнай на сьвяце была прысутнасьць украінцаў. Прадстаўнікі ад Аб'еднаньня ўкраінскіх работнікаў у Францыі і ад Украінскага Вайсковага таварыства вельмі прыгожа прывіталі беларусаў з днём нацыянальнага сьвята.

Трэба зазначыць, што ўрачыстае сьвяткаваньне 25 Сакавіка было наладжанае першы раз у жыцьці беларускае эміграцыі ў Крэўсот і пакінула па сабе галосны водгук як між французаў, так і спасярод другіх нацыянальнасцяў.

* * *

22 траўня 1949 г. адбылася зборка беларускае моладзі (сяброў Беларускае Незалежніцкае Арганізацыі моладзі) Парыжу і правінцыі, на якой быў заложаны аддзел БНАМ у Парыжы. У склад Управы аддзелу ўвайшлі: Лысуха Мікалай — Старшыня, Юрчук Грыгор — заступнік, Касьцюк Геня — сакратар, Хоміч Міхась — скарбнік.

На гэтай жа зборцы быў заложаны круг Старэйшых беларускіх скаўтаў у Францыі (Парыж), да якога ўступілі ўжо 15 сяброў.

Зборка кругу Старэйшых скаўтаў у Парыжы адбудзецца 5 чэрвеня 1949 г., адразу пасьля службы Божай у лесе за Парыжам. Дакладнае месца зборкі будзе ўстаноўлена на месцы.

* * *

19.6.49 г., Парыж. У памяшканьні Сындыкату беларускіх работнікаў у Францыі адбылася чарговая зборка Парыскага аддзелу БНАМ пад старшынствам сябра Лысухі. Апрача сяброў аддзелу ды сяброў Цэнтральнае Управы на зборцы прысутнічалі госьці — прэзыдэнт БНР спадар М. Абрамчык і Старшыня САБЭ спадар Л. Рыдлеўскі. Спадар Прэзыдэнт БНР у сваім выступе прызваў сяброў БНАМ да адзінства ў грамадзкай працы моладзі й да актывізаваньня ейных сілаў на агульную карысьць усяго паняволенага беларускага народу. На зборцы былі прынятыя аднагалосна тры пастановы: 1) аб правядзеньні народнага беларускага сьвята Купальля; 2) аб стварэньні гуртка самадзейнасьці пад кіраўніцтвам артыстага А. Кавалеўскага; 3) аб падшуканьні памяшканьня для Парыжскага аддзелу БНАМ. Уся зборка прайшла ў згоднай сяброўскай атмасфэры.

* * *

23.6.49 г., Парыж. У памяшканьні Сындыкату беларускіх работнікаў у Францыі адбылася чарговая лекцыя для моладзі спадара Прэзыдэнта БНР М. Абрамчыка аб дзяржаўным кіраўніцтве Беларусі. На лекцыі прысутнічала 12 сяброў БНАМ.

* * *

26.6.49 г., Парыж—Мэдон. Зь ініцыятывы Цэнтральнае ўправы БНАМ ды Парыжскага аддзелу ў Мэдонскім лесе было праведзенае масавае гуляньне сяброў БНАМ на знак народнага беларускага сьвята Купальля. У гуляньні прынялі ўдзел 16 сяброў БНАМ. Апрача гэтага прысутнічалі госьці-беларусы. Гуляньне прайшло весела і арганізавана, дружна пяяліся беларускія песьні, ладзіліся гульні, спаборніцтвы па валейболе, спаборніцтвы ў бегу на дыстанцыю ў 100 мэтраў, скокі ўвышкі ды розныя іншыя вясёлыя гульні й гутаркі. У бегу на дыстанцыю ў 100 мэтраў заняў першае мейсца спаміж хлапцоў сябра М. Наўмовіч, другое — сябра Хоміч, спаміж дзяўчатаў — сяброўка І. Захаркевіч. Сябры Дубоўскі і Якімовіч зрабілі колькі цікавых фатаграфічных здымкаў з паасобных мамэнтаў гуляньня.

* * *

28.6.49 г., Ісы ле Муліно. Тут адбылося чарговае паседжаньне Цэнтральнае ўправы БНАМ. Згодна з пастановаю Першага Зьезду моладзі ў Францыі пры БНАМ з 28.6.49 г. закладаецца Арганізацыя старэйшых скаўтаў, якая мае стацца дапаможным чыньнікам БНАМ для задзіночаньня беларускае моладзі і праводжаньня між ёю нацыянальна-ўзгадоўчай працы. Кандыдатура на галоўнага кіраўніка Кругу старэйшых скаўтаў у Францыі сябра М. Наўмовіча падтрыманая Цэнтральнаю ўправаю БНАМ і перасланая адпаведным лістом у Нямеччыну на зацьверджаньне Галоўнаму Кіраўніцтву Скаўтаў на чужыне.

* * *

28.6.49 г. пры Цэнтральнай управе БНАМ закладзены аддзел культуры. На кіраўніка аддзелу культуры прызначаны сябра А. Кавалеўскі. Сэкцыя культуры павінна займацца арганізаваньнем беларускае моладзі ў Францыі ў гурткі мастацкае самадзейнасьці.

* * *

4.12.1949 г. у памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату ў Парыжы адбылася кароткая акадэмія, прысьвечаная 29-ым угодкам Слуцкага паўстаньня. Былы паўстанец сп. Яцэвіч Аляксандар зрабіў кароткі і зьмястоўны даклад пра гісторыю паўстаньня. На заканчэньне акадэміі быў прасьпяваны беларускі нацыянальны гімн.

* * *

4.12.1949 г. у памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату адбылася чарговая зборка Парыскага аддзелу моладзі, на якой прысутнічала шмат гасьцей. Зборка пачалася адсьпяваньнем песьні «Беларусь, наша Маці-краіна». Старшыня Парыскага аддзелу сябра Лысуха адчыніў зборку і зачытаў пратакол з папярэдняй зборкі. Потым сябра Філістовіч зрабіў кароценькі нарыс зь дзейнасьці Арганізацыі моладзі ад пачатку яе існаваньня і выразіў сум з прычыны яго адыходу са становішча старшыні Цэнтральнае ўправы моладзі. У зьвязку зь яго адыходам, згодна са статутам, Цэнтральнай ўправе даручаецца дакааптаваць да ўправы яшчэ аднаго сябру і вызначыць часова старшыню, які зоймецца арганізацыйнай працай да часу скліканьня II-га агульнага Зьезду моладзі.

Пасьля абгаварваліся справы агульнага сьвяткаваньня Каляд і справы беларускага канцэрту, які адбудзецца ў месяцы студзені 1950 году.

Зборка закончылася агульным адсьпяваньнем песьні «У гушчарах».

* * *

21 студзеня 1949 г. у залі «Societes Cavantes» у Парыжы адбыўся «Вясёлы Беларускі вечар», зладжаны Беларускай Незалежніцкай арганізацыяй моладзі пад мастацкім кіраўніцтвам сябра А. Кавалеўскага. Перад шматколькаснай публікай былі прадстаўленыя беларускія народныя танцы, выкананыя ў беларускіх нацыянальных вопратках, некалькі камічных нумароў і беларускіх песень. Канцэрт быў так скампанаваны, што акрамя некалькіх паважных нумароў, былі самыя пацешныя пастаноўкі, якія выклікалі няўпынны сьмех і буру воплескаў. Чужынцы, якія прысутнічалі на вечары, былі моцна захопленыя ўдалым канцэртам. З камічных нумароў вялікі посьпех мелі сцэнкі сябра Кавалеўскага «Пятрусь Цялопа», «Барацьба Карлюкоў», «Лубок». Пасьля канцэрту госьці танцавалі аж да самага раньня. Грала добрая аркестра, быў добры буфет. Усе радасна, весела забаўляліся. Госьці вынесьлі прыемнае ўражаньне з канцэрту. Словам, вечар удаўся. Пажадана, каб нашая моладзь і надалей падрыхтоўвала і праводзіла падобныя імпрэзы — сабе на карысьць, а Бацькаўшчыне на славу, распаўсюджваючы яе імя між чужынцамі.

* * *

24 сьнежня 1949 г. стараньнем Беларускае Рэлігійнае місіі ў Парыжы была зладжаная супольная традыцыйная Куцьця. Усе беларусы з Парыжу і правінцыі, якіх лёс разлучыў з раднёю, мелі магчымасьць правесьці Сьвяты вечар у супольнай беларускай сям'і. Пад мэлёдыі беларускіх калядак вечар прайшоў вельмі міла. Дзед Мароз шчодра абдзяліў усіх падарункамі.

1950

* * *

25 сакавіка 1950 г. у залі Хрысьціянскага Сындыкату ў Парыжы адбыўся агульны гадавы зьезд Аб'еднаньня беларускіх работнікаў у Францыі.

Пасьля адкрыцця зьезду і выбару прэзыдыі генэральны сакратар АБРФ Л. Рыдлеўскі адчытаў справаздачу зь дзейнасьці сакратарыяту за мінулы год, якая, не зважаючы на вялікія матэрыяльныя цяжкасьці, была даволі плённай. Пасьля справаздачы Рэвізійнае камісіі і дыскусіі над справаздачамі прыступлена да перавыбараў управы, у склад якой увайшлі: генэральны сакратар — інж. Л. Рыдлеўскі, тэхнічны сакратар — А. Міцкевіч, скарбнік — а. Родзька, сябры ўправы — А. Монід і В. Бут-Гусаім. Выбраныя Рэвізійная камісія і сяброўскі суд ды намечаны плян працы на бягучы год. Закончыўся зьезд адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну.

* * *

Парыж, 26.3.50 г. Урачыстасьці сьвяткаваньня 32-е гадавіны абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі распачаліся аб 11 гадзіне ў беларускай капліцы ў Saint Sulpice ўрачыстай Багаслужбай, якую адслужыў а. рэктар Беларускае Рэлігійнае місіі Л. Гарошка і сказаў прыгожае, пачуцьцёвае казаньне. Таго ж дня папалудні ў залі Хрысьціянскага Сындыкату адбылася ўрачыстая акадэмія, якую распачалі беларускія дзеці харавою малітваю. Потым сп. А. Яцэвічам быў прачытаны зьмястоўны даклад аб незалежніцкіх змаганьнях беларускага народу.

На мастацкую частку акадэміі склаліся беларускія песьні ў выкананьні сябра Жаўняровіча і хору моладзі, дэклямацыі моладзі і школьнікаў, зь якіх на асаблівую ўвагу заслугоўваюць дэклямацыі сяброўкі Кузьміной, вучняў Л. і І. Шыманцоў і Т. Родзькі, а таксама проза ў мастацкім выкананьні сябра Кавалеўскага.

* * *

Le Creusot, 26.3.50 г. Стараньнем філіі Аб'еднаньня беларускіх работнікаў у Францыі быў урачыста азначаны Беларускі Нацыянальны Дзень. У нядзелю, 26.III а. Ф. Чарняўскі адправіў Божую Службу за беларускі народ і сказаў зьмястоўнае прыгожае казаньне. Таго ж дня пасьля супольнага абеду адбылася сьвяточная акадэмія ў залі Сындыкату, на праграму якое злажыліся: рэфэрат аб гісторыі 25-га Сакавіка, адчытаньне прамовы прэз. М. Абрамчыка, выгалашаньне ў Чыкагскім радыё, даклад аб супрацоўніцтве з украінцамі, беларускія песьні і дэклямацыі. У канцы сказаў вельмі прыгожае слова пад адрасам беларускага народу прадстаўнік французкага СЕТС сп. Буле і прадстаўнік ад украінскае сэкцыі АУРФ.

Сьвяткаваньне зрабіла на прысутных паважнае ўражаньне і адазвалася шырокім рэхам у французкіх і іншанацыянальных кругох, дзе — як радасная падзея, а дзе — як соль у воку.

* * *

Стразбург, 26.3.50 г. Сьвяткаваньне 25-га Сакавіка было азначана ўрачыстай акадэміяй у залі Colombophile, на якой былі прысутныя прадстаўнікі Французкай Канфэдэрацыі хрысьціянскіх работнікаў. У праграму склаліся прывітаньні

сп. Прэзыдэнта, прадстаўніка СЕТС і рэфэрат пра 25 Сакавіка сп. Раманчука.

* * *

Парыж, 1—2 красавіка 1950 г. У гэтыя дні стараньнем Генэральнага Сакратарыяту Французкай Канфедэрацыі хрысьціянскіх работнікаў была наладжана выстаўка-кірмаш, у якой прынялі ўдзел і чужанецкія арганізацыі, у тым ліку і сэкцыя гэтай Канфедэрацыі — Аб'еднаньне беларускіх работнікаў у Францыі. Беларуская выстаўка зьвяртала на сябе агульную ўвагу як дзеля свае атракцыйнасьці, так і дзякуючы ўдаламу яе разьмяшчэньню. Беларусы выставілі каля 80 экспанатаў: розныя гатункі беларускага палатна, ад найгрубейшага кужалю да намітак уключна, жаночую вопратку, шытую зь сялянскага палатна з каймою, вопратку, вышываную ўжо на эміграцыі, а таксама настольныя пісьменныя прылады і шкатулы, інкруставаныя саломаю мастаком сп. М. Сільвановічам. Куток быў аздоблены Пагоняю і сьцягамі. Кіраўніцтва выстаўкі падбала пра адпаведную абслугу, якая складалася з жанчын і дзяўчат, убраных у нацыянальную вопратку. Асаблівай атракцыяй была беларуская музыка, якая расходзілася з усіх галасьнікоў, змантаваных на залях выстаўкі. Наведвальнікі пачулі 20 беларускіх песьняў у выкананьні Забэйды-Суміцкага, якія граліся некалькі разоў у зьмену французкім мэлёдыям. Беларускі куток быў вельмі цікавы для французкага гледача і добра паслужыў справе папулярызацыі нашай народнай творчасьці на Захадзе.

II ЗЬЕЗД БЕЛАРУСКАЕ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЕ АРГАНІЗАЦЫІ МОЛАДЗІ Ў ФРАНЦЫІ

14 траўня 1950 году ў Парыжы, у памяшканьні СФТС — 26, Ру Маніалён, адбыўся II Зьезд Беларускае Незалежніцкае Арганізацыі ў Францыі (БНАМ)

Зьезд прайшоў у цёплай, сяброўскай атмасфэры і накрэсьліў перад арганізацыяй шэраг важных заданьняў. На Зьезьдзе, апрача сяброў БНАМ, прысутнічалі таксама госьці, спаміж іх — рэктар Беларускае Рэлігійнае місіі айцец Гарошка і старшыня Парыскага аддзелу Аб'еднаньня беларускіх работнікаў у Францыі сп. Яцэвіч.

Абраны прэзыдыюм (старшыня — сябра А. Кавалеўскі, сакратар — сябра В. Міцкевіч) правёў Зьезд у наступным парадку дня; 1) справаздача Старшыні БНАМ аб дзейнасьці Арганізацыі за 1949 год; 2) справаздача Рэвізійнае камісіі; 3) адчытаньне Статуту БНАМ; 4) дыскусыя пасьля справаздачаў; 5) перавыбары Галоўнае ўправы БНАМ; 6) выбары рэфэрэнтаў: культуры, прэсы, спорту, узаемадапамогі, сувязі зь іншымі нацыянальнасьцямі; 7) перавыбары Рэвізійнае камісіі і Сяброўскага суду; 8) плян працы БНАМ на 1950 год; 9) вольныя прапановы.

У сваёй кароткай справаздачы зь дзейнасьці БНАМ за 1949 год старшыня Арганізацыі сябра М. Наўмовіч падкрэсьліў шэраг дасягненьняў арганізацыі, якая сваёю працаю спрычынілася да пашырэньня імя беларуса між чужынцаў. Галоўную ўвагу ў сваёй справаздачы ён зьвярнуў на бесьперапынны выхад у сьвет часапісу «Моладзь», які, згодна з пастановаю Зьезду БНАМ, стаўся афіцыйным органам Арганізацыі, а таксама і на тыя вынікі БНАМ, якія прывялі да пасьпяховага паказу першага сапраўднага беларускага канцэрту ў Парыжы. Канцэрт гэты меў грашовы абарот, які аблічваецца ў 100 000 франкаў. Сябра Наўмовіч падкрэсьліў таксама дружную ахвярнасьць сяброў БНАМ, што спрычынілася да пабудовы прыгожага помніка зь беларускім надпісам над магілаю заўчасна памёршага сябры БНАМ сьв. пам. Ф. Паўлоўскага. Нагадваючы пра працу Галоўнай управы БНАМ, М. Наўмовіч зазначыў, што ўсе крокі да афіцыйнага зьлегалізаваньня Арганізацыі ўжо зробленыя перад адпаведнымі французкімі ўладамі, а з гэтага вынікае, што БНАМ мае права нармальна разгарнуць сваю дзейнасьць. Пералічыўшы гэтыя дасягненьні, сябра М. Наўмовіч на заканьчэньне свае справаздачы змушаны быў зазначыць, што дзейнасьць БНАМ за 1949 год хаця й азначылася вялікімі поступамі, але ня можа рахавацца за цалкам задавальняючую, бо ня поўнасьцю быў выкананы той плян працы, які быў накрэсьлены Першым Зьездам БНАМ, і таму заклікаў сяброў, прысутных на II-гім Зьезьдзе, да больш актыўнае і сьведамае працы на карысьць нашага народу і Бацькаўшчыны.

Рэвізійная камісія (старшыня сябра М. Лысуха) у сваёй справаздачы адзначыла дзейнасьць БНАМ як задавальняючую, падкрэсьліўшы, што каса БНАМ і каса часапісу «Моладзь» вядзецца стала і акуратна, а грошы з гэтых касаў былі выдадзеныя выключна на патрэбы Арганізацыі і часапісу. Са справаздачы Рэвізійнае камісіі стала ведамым, што ў гэтых касах ад часу існаваньня Арганізацыі знаходзілася амаль 50 000 франкаў, зь якіх засталося на дзень Зьезду 11 000 франкаў.

У дыскусіях аб справаздачах выступалі сябры, прысутныя на Зьезьдзе. Сябра А. Кавалеўскі між іншым зазначыў, што справа Скаўцкае арганізацыі ня можа належаць да кампэтэнцыі БНАМ, а таму павінна разглядацца як асобная арганізацыя, што мае над сабою кіраўніцтва Галоўнае Скаўцкае кватэры.

Сябра В. Міцкевіч у сваім выступе выразна намаляваў перад прысутнымі тое вялікае значэньне дзейнасьці Арганізацыі на чужыне, якое дапамагае нашым братом і сёстрам на паняволенай Бацькаўшчыне ў іхным гераічным змаганьні за адвечны ідэал нашага народу, за незалежнасьць Беларусі.

Пасьля дыскусіяў распачаліся перавыбары Галоўнае ўправы, якія, згодна з пастановаю Зьезду, былі праведзеныя шляхам адчыненага галасаваньня. Вынікі гэтага галасаваньня наступныя:

Старшыня Галоўнае ўправы БНАМ — сябра М. Наўмовіч; заступнік старшыні — сябра В. Забаўскі; сакратар — сябра В. Міцкевіч; скарбнік — сябра С. Бэўс.

Рэфэрэнты: культуры — сябра А. Кавалеўскі, спорту — сябра А. Монід, прэсы — сябра А. Міцкевіч, узаемадапамогі — сябра Фр. Ганкевіч, сувязі зь іншымі нацыянальнасьцямі — сябра М. Хоміч.

Гэткім чынам, Галоўная ўправа БНАМ, згодна з вырашэньнем II Зьезду БНАМ, сталася пашыранаю да 9 асобаў за кошт часовае ліквідацыі Управы Парыскага аддзелу БНАМ, кіраўніцтва якога аўтаматычна пераходзіць да Галоўнае ўправы.

У склад Рэвізійнае камісіі ўвайшлі наступныя сябры: Кавалеўская Валя (старшыня), Сьпічонак (сябра), Лысуха (сябра).

У склад Сяброўскага Суду ўвайшлі: Дударэвіч (старшыня), Юрлевіч (сябра), Кузьміна Ніна (сябра).

Пасьля перавыбараў быў падрабязна абгавораны і зацьверджаны II Зьездам БНАМ агульны плян працы Арганізацыі на 1950 год. Галоўныя пункты гэтага пляну наступныя:

1) арганізацыя культурна-мастацкіх выступаў і паказаў (падрыхтоўка да новага самастойнага канцэрту і да суполь-

ных канцэртаў зь іншымі нацыянальнасьцямі); 2) падняцьцё на вышэйшы ўзровень часапісу «Моладзь»; 3) выдаваньне за кошт грашовых ахвяраў сяброў БНАМ беларускіх кніжак, патрэбных дзеля грамадзкага і нацыянальнага ўзгадаваньня беларускае моладзі на эміграцыі (першаю да друку на цыклястылі прызначаная кніжка «Беларусь у ліках і фактах»); 4) нацыянальнае і культурнае ўзгадаваньне моладзі (ладжаньне рэфэратаў з нагодаў угодкаў слаўных сыноў нашае Бацькаўшчыны, а гэтаксама рэфэратаў на тэмы агульна-выхаваўчыя); 5) прыцягненьне ў шэрагі БНАМ як найбольшай колькасьці сяброў з моладзі, што з тых ці іншых прычынаў знаходзіцца яшчэ па-за межамі арганізацыйнага жыцьця; 6) закладаньне новых аддзелаў БНАМ на тэрэне Францыі і вядзеньне сьціслае сяброўскае сувязі з тымі адзінкамі нашае моладзі, якія закінутыя лёсам у чужацкія асяродкі на правінцыях.

Другі Зьезд БНАМ пастанавіў зьвярнуцца з просьбаю да рэктара Рэлігійнае місіі ў Парыжы айца Гарошкі, каб ён прыняў на сябе абавязкі апекавацца жыцьцём і дзейнасьцю БНАМ.

Зачыняючы II Зьезд БНАМ, старшыня Зьезду сябра А. Кавалеўскі падзякаваў за пасьпяхова праведзеную працу і пажадаў усім сябром БНАМ посьпеху і плённае працы на карысьць паняволенага беларускага народу.

* * *

25 чэрвеня ў Парыскай беларускай калёніі адбылося сьвяткаваньне 8-ых угодкаў трагічнае сьмерці Янкі Купалы. З гэтае нагоды раніцай у беларускай капліцы пры касьцёле Saint Sulpice правілася Багаслужба, пасьля якой была адслужана паніхіда. Рэктар Беларускае Рэлігійнае місіі ў Парыжы з гэтае нагоды выгаласіў прыгожае казаньне.

Па абедзе ў залі Хрысьціянскага Сындыкату адбылася ўрачыстая акадэмія, зладаваная Управай БНАМ. Рэфэрат аб жыцьці і творчасьці Янкі Купалы зачытаў сябра В. Міцкевіч, пасьля чаго адбылася мастацкая частка акадэміі, на якую злажыліся дэклямацыі сяброў.

Заля была прыгожа ўдэкараваная бел-чырвона-белымі сьцягамі, Пагоняю, партрэтам Янкі Купалы з чорнай перавязкай і вялікай колькасьцю прыгожых ружаў. Прысутнічала многа гасьцей і моладзі.

Акадэмія закончылася супольным адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну.

* * *

23 ліпеня 1950 г. у памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату адбыўся сход сяброў усіх беларускіх арганізацыяў у Парыжы і ваколіцы, на якім усім сябрам былі раздадзены кніжкі Беларускага Эмігранта, ці т. зв. Кніжкі самападаткаваньня.

* * *

25.VII.1950 г. пакінуў Парыж тэхнічны супрацоўнік «Моладзі» сябра Каранеўскі Мар'ян, які выэміграваў у Новую Зэляндыю.

Рэдакцыя «Моладзі» і ўсе сябры складаюць яму шчырую падзяку за працу і жадаюць шмат шчасьця ў асабістым жыцьці і плённай працы на карысьць беларускага народу на новым месцы жыхарства.

* * *

22.10.1950 г. у залі Хрысьціянскага Сындыкату адбылася зборка Парыскай калёніі беларусаў у Францыі, на якой спадар Прэзыдэнт Абрамчык расказаў прысутным пра падарожжа ў Злучаныя Штаты Амэрыкі, а таксама пра жыцьцё нашых суродзічаў на амэрыканскім кантынэнце. Яго расказ моцна зацікавіў прысутных і сьцягнуў на зборку шмат слухачоў.

* * *

Парыж. 26 лістапада г. г. з нагоды 30-ых угодкаў Слуцкага паўстаньня ў беларускай капліцы пры Saint Sulpice адбылася жалобная паніхіда памяці ўсіх змагароў, якія памерлі ў барацьбе за волю Бацькаўшыны. Пры гэтай нагодзе айцец Гарошка сказаў прыгожае, зьмястовае казаньне.

Гэтага ж дня, пасьля абеду, у памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату была ладжана акадэмія чэсьці Слуцкага паўстаньня. Памяць паўшых герояў была ўшанавана хвілінным маўчаньнем. Кароценькі рэфэрат аб прабегу Слуцкага паўстаньня зачытаў сябра Філістовіч. Пасьля яго, бралі слова сп. Яцэвіч і сп. Рыдлеўскі, абодва ўдзельнікі паўстаньня.

Акадэмія закончылася агульным адспяваньнем беларускага нацыянальнага гімну.

* * *

Крэўсот. 26 лістапада 1950 г. стараньнем мясцовай філіі АБРФ была ладжана сьвяточнага акадэмія, прысьвечаная 30-ым угодкам Слуцкага паўстаньня. На праграму склаліся: вельмі зьмястоўны і кранаючы сэрцы ўсіх прысутных рэфэрат аб Слуцкім Паўстаньні спадара Трусава, дэклямацыі патрыятычных вершаў сп. Трусавым і ягоным 6-цігадовым сынам.

Памяць паўшых герояў была ўшанавана хвілінным маўчаньнем. Пасьля група сяброў у Крэўсот прапяяла некалькі беларускіх песьняў.

Вельмі прыгожае прывітальнае слова сказаў прысутны на сьвяце галава мясцовай філіі Вайсковага Таварыства быўшых ваякаў УНР.

Сьвята закончылася адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну. Яно прайшло ў вельмі паважнай, сяброўскай атмасфэры. Гэтым нашыя сябры ў Крэўсот яшчэ раз далі доказ свае салідарнасьці і патрыятычнасьці. Яны паказалі ўсім чужынцам у Крэўсот, што беларускі народ жыве і прадаўжае барацьбу за волю.

* * *

Парыж. 10.12.1950 г. у залі Хрысьціянскага Сындыкату адбылася чарговая зборка Парыскага адзьдзелу АБРФ. На тэму дня было пастаўлена пытаньне падрыхтоўкі да гадавое зборкі Сындыкату і ўлажэньне пляну працы АБРФ.

1951

* * *

Парыж, 21.1.1951 г. У Нотр Дам дэ Пары з нагоды Тыдня малітвы за аб'еднаньне ўсіх хрысьціян і 1200 угодкаў сьмерці сьв. Івана Дамаскіна адбылася ўрачыстая багаслужба, якую адслужыў S. B. Maxime IV Salegh, патрыярх Антыёхіі і ўсяго Усходу, у саслужэньні 2-х епіскапаў і 8-і рэктараў чужынецкіх місіяў бізантыйскага абраду ў Парыжы. Ад беларускага духавенства служыў рэктар Беларускае Рэлігійнае місіі айцец Гарошка.

З нагоды ўрачыстага сьвята першы раз у Нотр Даме быў заінсталяваны тэлевізійны апарат, які тэлевізаваў прабег багаслужбы. Радыё таксама перадавала на парыскіх хвалях прабег імшы, а амаль усе парыскія газэты пісалі пра гэтую падзею, пералічваючы ўсіх удзельнікаў багаслужбы.

* * *

Парыж, 27.1.1951 г. У салёнах «Дэлбор» адбылася супольная беларуска-ўкраінская забава, арганізаваная беларускай і ўкраінскай сэкцыямі СФТС (Сэкцыі Хрысьціянскага Сындыкату). Забава сьцягнула ў салёны вялікую колькасьць людзей усіх нацыянальнасьцяў. Прабегла яна ў сымпатычнай атмасфэры. Усе вынясьлі б вельмі прыемнае ўражаньне зь яе, а ў першую чаргу ініцыятыўны камітэт, калі б не было лістовак на французкай мове, якія ўкраінскія студэнты раздавалі тайком для ўсіх прысутных, за выняткам беларусаў. Лістоўкі выданыя ў 33-я ўгодкі сьмерці 300 украінскіх студэнтаў, расстраляных бальшавікамі пад Крутамі, на іх нарысаваная карта Украіны, загортваючая ўсё беларускае Палесьсе аж пад Баранавічы. Гэты факт кідае цень на брацкія суадносіны беларускага і ўкраінскага народаў. Падобнае паступованьне ўкраінскіх студэнтаў у Парыжы сьведчыць аб іх нявыхаванасьці і неляяльнасьці ў адносінах да беларусаў, тым больш, гэта рабілася падчас вечару, ладжанага для навязаньня бліжэйшых добрасуседзкіх адносінаў.

* * *

Парыж, 11 лютага 1951 г. У залі Хрысьціянскага Сындыкату адбылася гадавая зборка Парыскага адзьдзелу Аб'еднаньня беларускіх работнікаў у Францыі, на якой пасьля справаздачы былога старшыні філіі і справаздачы рэвізійнае камісіі адбыліся перавыбары ўправы. У новую ўправу ўвайшлі: старшыня — сп. Яцэвіч, сакратар — сп. Бялевіч і скарбнік — сп. Чыгір.

* * *

Парыж, 25 Сакавіка. У гэты дзень адбылося сьвяткаваньне 33-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. Рана, а гадз. 11 у беларускай капліцы пры касьцёле Saint Sulpice адбылася ўрачыстая багаслужба. Пасьля абеду ў залі «Хаўрусу» была ладжана ўрачыстая акадэмія, якую адчынілі сп. прэз. Абрамчык доўгім і змястоўным дакладам. Дэклямацыі моладзі і сяброўскія сьпевы дапоўнілі праграму ўрачыстасьці. Акадэмія закончыася агульным адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну.

* * *

31.III—I.IV у памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату ў Парыжы адбылася першая канфэрэнцыя хрысьціянскіх вольных сындыкалістых Цэнтральнае і Усходняе Эўропы, прыбалтыцкіх і балканскіх краінаў. У канфэрэнцыі прынялі таксама ўдзел беларускія дэлегацыі з Францыі і Бэльгіі. Акрамя прадстаўнікоў паняволеных народаў у канфэрэнцыі ўдзельнічалі сындыкалістыя заходніх дзяржаваў: Францыі, Італіі , Бэльгіі, Галяндыі, Люксэмбургу, Вялікай Брытаніі, Нямеччыны і Швайцарыі. Канфэрэнцыя мела на мэце каардынацыю працы ўсіх хрысьціянскіх работнікаў у іх барацьбе з камунізмам, сацыяльную і праўную апеку работнікаў. Перад заканьчэньнем канфэрэнцыі быў выбраны выканаўчы камітэт, у склад якога ўвайшлі: старшыня — паляк, 1-шы заступнік старшыні — беларус, генэральны сакратар — украінец.

* * *

8-га красавіка ў памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату адбыўся 3-ці зьезд БНАМ у Францыі. Сябры з правінцыі пераслалі свае галасы і паўнамоцтвы сябрам у Парыжы, якія прысутнічалі на зьедзе. Пасьля справаздачы дасюлешняга старшыні моладзі і справаздачы Рэвізійнае камісіі, была выбрана новая ўправа, у склад якой увайшлі: старшыня — сябра Наўмовіч Міхась, сакратар — сябра Міцкевіч Валянтын, скарбнік — Касьцюк Гені. Быў прыняты наступны плян дзеяньня на бягучы год: далейшая выдача часапісу «Моладзь», зрабіць цыклястыльнае другое выданьне кніжкі «Беларусь у датах, ліках і фактах» з пашыранымі і больш апрацаванымі матэрыяламі, выдача іншых кніжак і брашураў узгадаваўчага зьместу, ладжаньне акадэміяў, прагулак, праводжаньне ўзгадаваўчае працы. Сябром БНАМ былі раздадзены сяброўскія легітымацыі. На выдаваньне часапісу і расходы арганізацыі ўстаноўлены сяброўскія складкі да 100 фр. на месяц.

* * *

14 і 15 красавіка г. г. у залях Хрысьціянскага Сындыкату адбылася міжнародная выстаўка-кірмаш. Беларуская сэкцыя работнікаў у Парыжы наладзіла выстаўку беларускіх тканінаў, вышывак і дробных мастацкіх вырабаў. Сцэны беларускага куточка ўпрыгожвалі маляваныя абразы сябра Жаўняровіча. Прадаваліся беларускія брашуры, часапісы, паштоўкі.

Шкада, што ня было беларускіх абаранкаў або іншых характэрных беларусам прысмакаў, бо гэта напэўна мела б вялікі посьпех у наведваньнікаў выстаўкі-кірмашу.

* * *

Падобна, як у мінулым годзе, на Сёмуху, 12, 13 і 14 траўня г. г. адбылося вялікае паломніцтва студэнтаў з Парыжу ў Хартрэс. У грамадзе 9 000 французкіх студэнтаў прынялі ўдзел прадстаўнікі студэнтаў розных нацыянальнасьцяў, між якімі і беларускія. Тры дні маршу польнымі дарожкамі цераз зялёныя палі, супольныя малітвы паломнікаў і фізічныя высілкі, спрычыніліся да навязаньня бліжэйшых сяброўскіх суадносінаў паміж студэнтамі розных нацыянальнасьцяў.

* * *

Парыж, 10 чэрвеня г. г. У залі Хрысьціянскага Сындыкату адбылася гадавая зборка сяброў Выдавецкага фонду ў Францыі. Старшыня фонду даў справаздачу зь дзейнасьці арганізацыі, прадставіўшы здабыткі яе, куплю ручное друкарні, выдачу ў сьвет 3-х нумароў газэты «За Волю». Пасьля абсалюторыі адступаючай управе выбралі новую, у склад якое ўвайшлі: старшыня — Шыманец Ул., сакратар — Міцкевіч В., сябры — Бэўс С. і Лысуха М. Зборка аднагалосна прыняла пастанову, што дзеля выдачы газэты «За Волю» і ўдасканальваньня друкарні ўсе сябры фонду будуць плаціць сяброўскія складкі ў суме 200 фр. на месяц.

* * *

1 лістапада г. г. у Задушны дзень, калі пасталі ўсе фабрыкі і заводы, а людзі йшлі на могілкі, каб злажыць памяць сваім родным і знаёмым, што адышлі на той сьвет, магіла сябра Паўлоўскага на адным з парыскіх могільнікаў таксама мела шмат наведвальнікаў. Група беларусаў з Парыскае калёніі выбрала гэтую магілу, як сымбалічную, каб над ёю выслухаць паніхіду, адпраўленую айцом Львом за памяць усіх паўстанцаў і змагароў, паўшых у барацьбе за волю народу і ўсіх нявінных ахвяр, замучаных бальшавікамі ў канцлягерах Сібіру. Каб Бог выслухаў іх скромную малітву, спыніў крывавы перасьлед на Беларусі, а яе выгнанцаў вярнуў у вольную і незалежную Бацькаўшчыну.

Стараньнем нашага выдавецтва выйшла ў сьвет брашура Л. Іскры пад загалоўкам «Своеасаблівасьці беларускае мовы». Брашуру можна набыць у рэдакцыі «Моладзі».

* * *

Парыж. 25 лістапада Парыская калёнія беларусаў абходзіла 31-ю гадавіну Слуцкага паўстаньння. Рана, а гадз. 11-ай у бел. капліцы пры касьцёле Saint Sulpice адбылася багаслужба, пасьля якой была адпраўлена паніхіда за душы загінуўшых паўстанцаў. З нагоды так паважнага і жалобнага сьвята айцец Леў сказаў вельмі прыгожае казаньне, у якім зьвярнуў увагу на вернасьць і беларускую вернасьць асабліва.

Пасьля абеду ў памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату адбылася ўрачыстая акадэмія, на якой прысутнічала шмат беларусаў з Парыжу і ваколіц, а таксама гасьцей. Пра прабег Слуцкага паўстаньня меў зьмястоўны і цікавы даклад стары случак сп. Яцэвіч. Пасьля яго ўзяў слова сябра Міцкевіч В., які кораценька сказаў пра значэньне паўстаньня, а спадар Рыдлеўскі дадаў свае кароткія ўспаміны. На мастацкую частку злажыліся: «Помнік» — зачытаны сп. Пузоўскім, «Монтэ-Касына» — сп-ня Н. Абрамчык і «Праз сьлёзы» — сябра Міцкевіч В. На заканчэньне акадэміі прысутныя супольна адсьпявалі наш нацыянальны гімн. Пасьля заканчэньня акадэміі адбылася надпраграмовая частка дня — цікавая лятарэя, у якой цэнтрам зацікаўленьня быў фатаграфічны апарат, які выграла адна маладая сяброўка сходкі.

* * *

26 лістапада 1951 г. у Вэсінэт пад Парыжам, у прыватным французкім гуртку студыяў замежных краін сябра Наўмовіч Міхась меў даклад пра Беларусь, яе геаграфічнае паложаньне і кароткі нарыс гісторыі ды змаганьня беларускага народу за незалежнасьць. Пасьля дакладу прысутны сябра Жаўняровіч Віктар запяяў некалькі беларускіх народных мэлёдыяў. Даклад і беларускія песьні моцна зацікавілі ўсіх прысутных, аб чым яны пазьней выказваліся ў сваіх падзяках дакладчыку.

* * *

Крэзо, 11 лістапада. Гэта вялікі дзень у гісторыі народаў, заканьчэньне Першае Сусьветнае вайны, хаця для нас, беларусаў, гэты дзень нічога добрага не прынёс. Тым ня менш, беларусы ў Крэзо адзначылі яго ўрачыста. Маршавая калёна прайшла праз увесь горад і перад помнікам Нязнанага жаўнера злажыла кветкі. У паходзе бралі ўдзел пераважна французы, а з чужынцаў толькі 3 групы: беларусы, украінцы і палякі. Удзел беларусаў у гэтай маніфэстацыі моцна не спадабаўся нашым суседзям з усходу, якіх у Крэзо ёсьць вельмі многа.

* * *

25 лістапада беларусы ў Крэзо ў залі «Societes» урачыста абходзілі 31-я ўгодкі Слуцкага паўстаньня, каб гэтым аддаць пашану тым змагаром, якія злажылі сваё жыцьцё на алтар Бацькаўшчыны. Сьвята распачаў прывітальным словам старшыня мясцовай Філіі АБРФ, пасьля якога прысутныя супольна адсьпявалі беларускі нацыянальны гімн. Рэфэрат аб значэньні Слуцкага паўстаньня зачытаў сябра Булыга Міхась. Ад гасьцей мелі прывітальныя словы: старшыня Украінскай Еднасьці і старшыня Вайсковага Таварыства ваякаў УНР. На мастацкую частку злажыліся: вершы «Пагоня», «Сьмерць паўстанца юнака», «Ліст да нязнанага брата беларуса», вальс «Вечарына», адыграны маладым 6-цігадовым хлопчыкам, песьня «Слуцкія ткачыхі» і верш Цёткі «Веру, братцы, людзьмі станем». На заканчэньне акадэміі яшчэ раз усімі супольна быў адсьпяваны беларускі нацыянальны гімн.

1952

* * *

Парыж, 24 лютага 1952 г. У памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату адбылася гадавая зборка беларускай сэкцыі БРФ, на якой былі праведзены перавыбары Генэральнага Сакратарыяту. У склад новае ўправы ўвайшлі: старшыня: сп. Яцэвіч Аляксандар; заст. старшыні: сп. Хоміч Міхась; сакратар: сп. Міцкевіч Валентын; скарбнік: сп. Чыгір Янка; сябра ўправы: сп. Наўмовіч Міхась.

Сябру Хомічу Міхасю даручана весьці справы парыскае сэкцыі. Усю карэспандэнцыю ў сындыкацкіх справах кіраваць на адрас: CFTO, Section Bielorussienne, Rue Montholon, Paris 9.

* * *

Парыж, 19.3.1952 г. У залі Мутуалітэ з нагоды 15-ых угодкаў каранацыі Папы Пія XII адбылася дэманстрацыя парыжан, каб выявіць перад усім сьветам сваю гатовасьць ісці за Свяцейшым айцом за захаваньне міру. На маніфэстацыі прысутнічалі Папскі нунцый і Архіепіскап Парыжу. Акра-

мя французкіх вернікаў у маніфэстацыі бралі ўдзел прадстаўнікі ўсіх чужынецкіх місіяў у Парыжы з сваімі нацыянальнымі сьцягамі і ў нацыянальных вопратках. Між іншымі прыгожа красаваўся бел-чырвона-белы сьцяг з Пагоняй.

* * *

30 сакавіка г. г. парыская калёнія беларусаў абходзіла 34-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. Рана ў касьцёле Сан Сульпіцэ а. Леў адправіў службу Божую, а па абедзе ў памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату была наладжана ўрачыстая акадэмія. Рэфэрат аб разьвіцьці палітычных падзеяў 1914—18 гг. на землях Беларусі і абвешчаньні Акту 25 Сакавіка прачытаў сп. Яцэвіч А. На мастацкую частку злажыліся дэклямацыі моладзі і сьпеў сябра Жаўняровіча. Пры нагодзе сябра Наўмовіч М. падзяліўся з прысутнымі сваімі ўражаньнямі са сьвяткаваньня 25 Сакавіка і адкрыцьця Беларускага студэнцкага дому ў Лювэне.

* * *

26 красавіка г. г група беларускіх студэнтаў у Лювэне на просьбу беларускае моладзі ў Францыі наладзіла ў Парыжы свой першы канцэрт песьні і танцаў. Зь вялікай ахвотай і энтузыязмам ехалі беларусы ў Парыж, каб сваім высокамастацкім сьпевам пацешыць слухачоў-беларусаў, а таксама і чужынцаў. Вечар адбыўся ў залі Дзёцэзанскага Дому каталіцкіх студэнтаў на Rue Madame. Спачатку харыстыя, ня маючы адпаведнага акампанімэнту, бо іх піяністы ня змог зь імі прыехаць і трэба было знайсьці чужога, пяялі крыху няўпэўнена, але паступова, падбадзёраныя воплескамі слухачоў, галасы іх мацнелі ды зьліваліся ў магутную мэлёдыю, якая ўсхвалявана перадавала слухачам глыбокую пачуцьцёвасьць беларускае песьні. На зьмену хору прыходзілі сольныя выступы сябра Сянкоўскага і сябра Цьвіркі ды прыгожыя, удала выконваныя, народныя танцы «Лавоніха», «Крыжачок» і «Мяцеліца». Таксама адналітая нацыянальная вопратка красавала на сцэне сваім прыгаством. Таму нават прысутныя чужынцы, якія не разумелі беларускае мовы, а некаторыя спаткаліся зь ёю першы раз, з захопленьнем слухалі мэлёдыйныя гукі і вынесьлі з канцэрту вельмі добрае ўражаньне. Закончыўся ён жвавым народным танцам «Мяцеліца», а пасьля людзі нейк неахвотна пакідалі залю ды ўсьцяж аглядаліся на сцэну, быццам жадалі яшчэ штось пабачыць.

Назаўтра, 27 красавіка, яшчэ раз беларуская калёнія мела прыемнасьць паслухаць нашых харыстых у капліцы пры касьцёле Сан Сульпіцэ, якія пяялі да службы Божае, адпраўленае а. Львом. Капліца напоўнілася ня толькі беларусамі, але і французамі, якія жадалі паслухаць рэлігійных песьняў усходняга абраду.

У гэты ж дзень пасьля скромнага абеду нашыя госьці разышліся па Парыжы, хто на вежу Эйфэля, хто на Канкорд, а хто на Пантэон, каб аглянуць прыгожы горад. А ў панядзелак з жалем пакідалі яго, каб вяртацца да сваіх заняткаў, да навукі. Але ўсе яны гаварылі, што да нас вернуцца. Мы будзем іх чакаць, зь вялікай прыемнасьцю спатыкаць і гасьціць у Парыжы.

* * *

18 траўня г. г. у Хрысьціянскім Сындыкаце адбылася зборка Парыскай беларускай калёніі, на якой сп. Прэзыдэнт Абрамчык зрабіў цікавы інфармацыйны даклад пра сваю апошнюю паездку ў Амэрыку. Пасьля дакладу сп. Яцэвіч, старшыня ЗБРФ, падаў інфармацыйныя весткі адносна арганізацыі, а на заканчэньне зборкі адбылася маленькая лятэрэя, ладжаная БНАМ, даход зь якое быў прызначаны на новыя выданьні «Моладзі».

* * *

8 чэрвеня беларуская Парыская калёнія абходзіла 10-я ўгодкі сьмерці нашага нацыянальнага прарока — Янкі Купалы. Рана а гадз. 11-ай у Беларускай Капліцы адбыліся служба Божая і жалобная паніхіда, адпраўленая а. Львом, а папалудні ў Хрысьціянскім Сындыкаце — скромная акадэмія, на якой сп. Яцэвіч А. зачытаў рэфэрат пра творчасьць Янкі Купалы і Язэпа Пушчы, таленавітага маладога паэта, зьнішчанага бальшавікамі, якога дакладчык асабіста ведаў.

* * *

9.8.1952 г. у мястэчку Бры пад Парыжам адбылося вясельле сябра БНАМ Сымона Дударэвіча зь сяброўкай Нінай Дышлюк. Царкоўны шлюб даў рэктар Беларускае Рэлігійнае місіі ў Францыі а. Леў Гарошка. Пры пашлюбным абедзе весела гучалі галасы субяседнікаў, фальклёрныя песьні. Пасьля абеду пад гукі музыкі сп. Шляхеткі пайшлі субяседнікі ў скокі: «Крыжачок», «Лявоніха», «Юрачка» прыходзілі сабе на зьмену. На заканчэньне сп. Яцэвіч А. сказаў

прыгожую прамову патрыятычнага зьместу. Рэдакцыя «Моладзі» і Управа БНАМ складае сябру Дударэвічу і яго сужонцы самыя шчырыя пажаданьні шчасця ў сямейным жыцьці.

* * *

У нядзелю, 5 кастрычніка 1952 г. у памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату адбылася зборка Парыскай беларускай калёніі, галоўным пытаньнем было абвешчаньне камунікату аб прызнаньні французкімі ўладамі беларускае нацыянальнасьці. Як усім ведама, у часы існаваньня ІКО беларуская нацыянальнасць была прызнаваная і ўпісвалася ў асабістыя паперы беларусаў у Францыі, але пад канец існаваньня вышэй напамянутай інстытуцыі была паўстрымана выдача даведак з беларускай нацыянальнасцю, і французкія ўлады прыпісвалі нашым суродзічам найчасцей падданства акупуючай нас краіны, у якой кожны пражываў перад вайною. Гэтую справу ўрэшце ўдалося наладзіць, і дзеля гэтага ўсе беларусы на тэрыторыі Францыі, якія маюць у сваіх картах іншую нацыянальнасьць, могуць зьвяртацца да рэктара Беларускае місіі ў Парыжы а. Льва Гарошкі: 95, Rue de Serves, Paris 7. Ён вырабіць належныя даведкі, паводле якіх французкія цывільныя ўлады зьменяць у паперах нацыянальнасьць на беларускую.

* * *

7 сьнежня 1952 г. Беларуская калёнія ў Парыжы ўрачыста абходзіла 32-я угодкі Слуцкага паўстаньня. Рана адбыліся 2 урачыстыя Багаслужбы з жалобнай паніхідай па загінуўшых героях: адна ў праваслаўнай украінскай царкве адпраўлена а. Смаршчком у саслужэньні з а. Фінкоўскім (да Багаслужбы пяяў беларускі студэнцкі хор зь Лювэну); а другая — у беларускай капліцы пры касьцёле Saint Sulpice адпраўлена а. Гарошкам.

Пасьля абеду ўсе беларусы з Парыжу і ваколіцаў, а таксама госьці, сабраліся ў залі Хрысьціянскага Сындыкату на ўрачыстую акадэмію. Паміж гасьцямі быў прысутны вялікі прыяцель і апякун беларускіх студэнтаў у Лювэне а. Робэрт, які падарожнічаў па Францыі, але калі даведаўся аб тым, што беларускія студэнты зь Лювэну прыяжджаюць у Францыю на акадэмію, спэцыяльна прыехаў з Grenoble у Парыж, каб прысутнічаць на выступе.

Акадэмію адчыніў старшыня БНАМ сябра М. Наўмовіч, перадаўшы слова сп. Прэзыдэнту Рады БНР М. Абрамчыку, які сказаў кароценькую гарачую прамову, цёпла вітаючы прысутнага госьця а. Робэрта. Пасьля сябра Міцкевіч В. зачытаў адозву генэрала брыгады сп. Кушаля Ф. Наступна кароценька прамаўляў а. Фінкоўскі, а пасьля — сп. Яцэвіч А., старшыня АБРФ, удзельнік Слуцкага паўстаньня, які зачытаў зьмястоўны даклад аб паўстаньні і аб трагічнай долі яго ўдзельнікаў.

Мастацкая частка была наладжана групай беларускіх студэнтаў зь Лювэну. Яна складалася зь вязанкі дэклямацыяў і песень. У бесьперапыннай зьмене чаргаваліся песьні: прыгожа-мэлёдыйныя «Слуцкія ткачыхі», жалобны «Хаўтурны марш», бадзёрыя і магутныя «Пагоня» і «Марш партызанаў», — заклікаючыя да далейшага змаганьня і перамогі. Песьні былі пераплятаныя дэклямацыямі урыўкаў з твораў волатаў беларускага слова.

* * *

29 сьнежня 1952 г. у памяшканьні YMCA ў Парыжы адбылася т.зв. «Surprise Party Internationale de Noel» (баль, буфэт і песьні), на якой прысутнічалі студэнты розных нацыянальнасьцяў з усяго сьвету. Вечар адбыўся ў вельмі сымпатычнай атмасфэры. Пад канец студэнцкімі групамі былі сьпяваныя калядныя песьні на розных мовах. Пяялі немцы, аўстрыйцы, мадзяры, славакі, палякі, туркі, індакітайцы, французы; можна было пачуць на вечары беларускую «Дуду». Сябра Наумовіч М. перш расказаў усім аб зьмесьце песьні, а пасьля, хоць і да сьпевакоў не належыць, бадзёра запяяў. Сваёю арыгінальнасьцю «Дуда» моцна спадабалася прысутным.

1953

* * *

8 лютага ў памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату адбылася зборка Парыскай сэкцыі CFTC, на якой сябра Міцкевіч В. зачытаў зьмястоўны даклад аб гістарычным развоі і значэньні хрысьціянскіх сындыкатаў, а таксама кароткі нарыс аб залажэньні і развоі беларускіх сэкцый, якія ўваходзяць у склад Французкай Канфэдэрацыі Хрысьціянскіх Работнікаў (CFTC). Пасьля дакладу адбылася карот-

кая дыскусія на тэму падрыхтоўкі да сьвяткаваньня 25 Сакавіка, якое адбудзецца ў нядзелю, 29 сакавіка 1953 г.

* * *

19 красавіка 1953 г. у памяшканьні Хрысьціянскага Сындыкату адбыўся чарговы агульны зьезд беларускіх сэкцыяў пры CFTC. Зьезд добра правёў сваю працу. У новую Цэнтральную ўправу былі выбраныя: Генэральны Сакратар — сябра Наўмовіч Міхась, заступнік — сябра Міцкевіч Валянтын, сакратар (тэхнічны) — сябра Лысуха М., скарбнік — сябра Пузоўскі З., сябры ўправы — Еляшэвіч і Мятла. У Рэвізійную камісію ўвайшлі а. Гарошка, сябра Яцэвіч і сябра Цыбульскі.

1954

* * *

28 сакавіка беларусы з Парыжу і ваколіц адзначылі 36-ыя ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. У Беларускай капліцы пры касьцёле Saint Sulpice адбылася урачыстая Служба Божая, якую адправіў рэктар Беларускай каталіцкай місыі ў Францыі а. Леў, прамовіўшы пры гэтай нагодзе прыгожае казаньне аб любові да Бацькаўшчыны. Папалудні таго ж дня адбылася акадэмія у залі Хрысьціянскага Сындыкату, якую ушанаваў сваёй прысутнасьцю monseigner Rupp — генэральны вікары для чужынцаў у Парыскім Архібіскупстве. Акадэмію адчыніў генэральны сакратар АБРФ сябра Наўмовіч Міхась і пасьля малітвы «Магутны Божа» зачытаў надасланыя прывітаньні. Пасьля прамаўляў монс. Руп, выказваючы сваю любоў да Беларусі. У шчырых бадзёрых словах ён выказаў свае пажаданьні, каб імкненьні нашы зьдзейсьніліся і мы змаглі адбудаваць незалежнасьць нашага краю. Потым сябра Міцкевіч Валянтын зачытаў даклад аб Сакавіковых падзеях. На мастацкую частку злажыліся дэклямацыі, сьпевы сола сябра Жаўняровіча В. і сьпевы з дыскаў М. Забэйды-Суміцкага і Беларускага Студэнцкага Хору ў Лювэне.